Міжнародная справаздача аб свабодзе веравызнання ў Беларусі за 2019 год

Асноўныя палажэнні

Канстытуцыя гарантуе грамадзянам свабоду веравызнання і магчымасць практыкаваць любыя рэлігійныя перакананні, але забараняе рэлігійную дзейнасць, накіраваную супраць суверэнітэту дзяржавы, яе канстытуцыйнага ладу і «грамадзянскай згоды». Закон прызнае «вызначальную ролю» Беларускай праваслаўнай царквы (БПЦ). Канкардат забяспечвае БПЦ такія правы і прывілеі, якіх не маюць іншыя рэлігійныя групы, аднак пры гэтым закон таксама прызнае гістарычную важнасць такіх «традыцыйных» канфесій, як каталіцтва, іўдаізм, іслам і евангельскае лютэранства. Закон забараняе любую рэлігійную дзейнасць з боку незарэгістраваных арганізацый. Улады працягвалі назіраць за рэлігійнымі меншасцямі і незарэгістраванымі рэлігійнымі групамі. Паводле закона, усе зарэгістраваныя рэлігійныя арганізацыі мусяць атрымліваць дазвол на правядзенне мерапрыемстваў па-за межамі сваіх памяшканняў, у тым ліку і для празелітызму, і павінны атрымаць папярэдні дазвол уладаў на ўвоз і распаўсюд рэлігійнай літаратуры. У ліпені мера пакарання за арганізацыю, кіраванне або ўдзел у незарэгіставаных арганізацыях была зменена з магчымага пазбаўлення волі ў рамках крымінальнага кодэкса на вынясенне штрафаў у рамках адміністрацыйнага кодэкса. Паводле новых рэгуляцый, тым не менш, чалавек можа быць аштрафаваны на суму ў памеры сярэдняга пяцітыднёвага заробку без правядзення судовых слуханняў, што, як сцвярджаюць праваабаронцы, з’яўляецца трывожным сігналам. Прадстаўнікі Сведак Іеговы паведамлялі, што праводзілі штотыднёвыя рэлігійныя службы па ўсёй краіне без умяшальніцтва міліцыі, але працягвалі мець складанасці з атрыманнем рэгістрацыі сваіх мясцовых рэлігійных суполак. У іншых рэлігійных меншасцяў таксама па-ранейшаму былі праблемы з рэгістрацыяй. Рымска-каталіцкія групы працягвалі паведамляць, што ўлады адмаўлялі ў візах і адхілялі заяўкі на працягненне знаходжання ў краіне некаторых замежных місіянераў. Праваабарончыя арганізацыі адзначалі пашырэнне доступу мусульманскіх і пратэстанцкіх святароў да зняволеных у турмах. Цягам года прадстаўнікі ўладаў працягвалі ўшаноўваць памяць ахвяраў Халакосту, падтрымліваць захаванне габрэйскіх могілак, а таксама ствараць мемарыялы на месцах забойстваў габрэяў. 28 сакавіка,

падчас урачыстага адкрыцця на тэрыторыі Трасцянецкага канцэнтрацыйнага лагера помніка 10 тысячам загінулых габрэяў пераважна аўстрыйскага паходжання, Прэзідэнт Лукашэнка назваў захаванне памяці аб гэтых ахвярах “святым”.

Нягледзячы на афіцыйную забарону, з Расіі працягвалі паступаць і былі даступныя ў краіне друкаваныя і відэаматэрыялы антысеміцкага характару. Міжканфесійныя хрысціянскія групы супольна працавалі над дабрачыннымі праектамі і праграмамі. Паводле інфармацыі Сведкаў Іеговы, лекары працягвалі прызначаць вернікам працэдуру пералівання крыві як адзін з відаў лекавання, нягледзячы на іх адкрытую пісьмовую адмову ад гэта маніпуляцыі.

Цягам года Часовы Павераны рэгулярна браў удзел у сустэчах на вышэйшым узроўні, на якіх абмяркоўваліся пытанні свабоды веравызнання, рэгістрацыі рэлігійных супольнасцяў і антысемітызму. У чэрвені Часовы Павераны і іншыя прадстаўнікі амбасады ЗША сустрэліся з Упаўнаважаным па справах рэлігій і нацыянальнасцяў з мэтай абмеркаваць пытанні рэлігіі і захавання габрэйскіх мемарыяльных аб’ектаў. У траўні супрацоўнікі амбасады ЗША разам са Старшынём Камісіі Злучаных Штатаў па абароне амерыканскай спадчыны за мяжой узялі ўдзел у цырымоніі перазахавання парэштак ахвяраў габрэйскага гета ў Брэсце. У ліпені супрацоўнікі амбасады наведалі памятныя мерапрыемствы, прысвечаныя Халакосту, і прысутнічалі на ўрачыстым адкрыцці мемарыялу ў Навагрудку. Часовы Павераны і іншыя супрацоўнікі амбасады сустракаліся з прадстаўнікамі габрэйскіх суполак для абмеркавання праяваў антысемітызму і захавання габрэйскай рэлігійнай спадчыны. Супрацоўнікі амбасады таксама сустракаліся з рыма-каталікамі, пратэстантамі, вернікамі Сведкаў Іеговы і іншымі групамі, з актывістамі грамадзянскай супольнасці і адвакатамі рэлігійных груп для абмеркавання дзяржаўных абмежаванняў на рэгістрацыю і дзейнасць рэлігійных меншасцяў.

Раздзел I. Рэлігійная дэмаграфія

Урад ЗША ацэньвае агульную колькасць насельніцтва ў 9,5 млн чалавек (дадзеныя сярэдзіны 2019 года). Згодна з апытаннем Дзяржаўнага інфармацыйна-аналітычнага цэнтра пры Адміністрацыі Прэзідэнта, праведзеным у студзені 2016 года, блізу 53 % дарослага насельніцтва належыць да БПЦ, 6 % - да Рымска-каталіцкай царквы. Паводле апытання, праведзенага дзяржавай, 8 % дарослага насельніцтва прыліч-

ваюць сябе да атэістаў, а 22 % не змаглі вызначыцца. Меншыя рэлігійныя групы, якія складаюць прыкладна 2 % насельніцтва, уключаюць іўдзеяў, мусульман, грэка-каталікаў (уніятаў), стараверaў (папоўцаў і беспапоўцаў), прадстаўнікоў Беларускай аўтакефальнай праваслаўнай царквы і іншых праваслаўных груп, лютэран, Сведкаў Іеговы, Апостальскіх хрысціян, прэсвітарыян і іншых пратэстанцкіх груп, прадстаўнікоў Армянскай апостальскай царквы, лаціна-каталікаў, прадстаўнікоў Міжнароднага таварыства Свядомасці Крышны, бахаяў, вернікаў Царквы Ісуса Хрыста Святых апошніх дзён і будыстаў. Габрэйскія суполкі паведамлялі, што налічвалі ад 30 000 да 40 000 іўдзеяў. Этнічныя палякі, якія складаюць блізу 3 % насельніцтва, як правіла з'яўляюцца рыма-каталікамі.

Раздзел II. Статус стаўлення ўладаў да свабоды веравызнання

Прававы кантэкст

Канстытуцыя гарантуе грамадзянам свабоду веравызнання і магчымасць практыкаваць любыя рэлігійныя перакананні ды ўдзельнічаць у актах пакланення, не забароненых законам. Яна прадугледжвае роўнасць усіх рэлігій перад законам. Канстытуцыя сцвярджае, што стасункі паміж дзяржавай і рэлігійнымі арганізацыямі мусяць рэгулявацца законам "з улікам іх уплыву на фармаванне духоўных, культурных і дзяржаўных традыцый беларускага народа". Яна забараняе дзейнасць рэлігійных груп, накіраваную супраць суверэнітэту дзяржавы, яе канстытуцыйнай сістэмы і грамадзянскай згоды, звязаную з парушэннем грамадзянскіх правоў і свабод, што "перашкаджае выкананню дзяржаўных, грамадскіх і сямейных абавязкаў" грамадзянамі або наносіць шкоду здароўю і маралі грамадства. Канстытуцыя сцвярджае, што закон вызначае ўмовы вызвалення ад вайсковай службы і ў якасці яе замены ўводзіць прызыў на альтэрнатыўную службу.

Апарат Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцяў (АУСРН) рэгулюе ўсе рэлігійныя пытанні. Апарат бярэ ўдзел у распрацоўцы і рэалізацыі дзяржаўнай палітыкі ў сферы рэлігіі, забяспечвае і абараняе рэлігійныя правы і свабоды, ажыццяўляе кантроль за дзейнасцю рэлігійных арганізацый і выкананнем іх статутаў, рэгулюе адносіны паміж дзяржавай і рэлігійнымі арганізацыямі, ажыццяўляе сувязь паміж дзяржаўнымі органамі і рэлігійнымі арганізацыямі на іх запыт, садзейнічае талерантнасці і ўзаемаразуменню паміж рэлігійнымі арганізацыямі розных канфесій і нацыянальнасцяў, а таксама вывучае

дынаміку і тэндэнцыі ў міжканфесійных зносінах з мэтай прадухілення "рэлігійнай выключнасці" і непаважлівага стаўлення да рэлігій і нацыянальнасцяў.

Закон прызнае “вызначальную ролю” БПЦ, Экзархату (аддзялення) Рускай праваслаўнай царквы, у развіцці традыцый народа, а таксама гістарычную значнасць рэлігійных груп, якія звычайна трактуюць як “традыцыйныя канфесіі”: каталіцтва, іўдаізму, ісламу і евангельскага лютэранства. Закон не разглядае ў якасці традыцыйных больш новыя рэлігійныя групы, а таксама больш старыя групы, такія як стараверы-беспапоўцы, грэка-каталікі (уніяты) і кальвінісцкія цэрквы, што сягаюць сваімі каранямі ў гісторыю краіны ад XVII стагоддзя.

Канкардат паміж дзяржавай і БПЦ забяспечвае БПЦ аўтаномію ў яе ўнутраных справах, свабоду ажыццяўляць рэлігійныя абрады і іншыя віды дзейнасці, а таксама асаблівыя стасункі з дзяржавай. Канкардат прызнае “ўплыў БПЦ на фармаванне духоўных, культурных і нацыянальных традыцый беларускага народа”. Хоць, паводле яго, пагадненне не абмяжоўвае свабоду веравызнання іншых рэлігійных групаў, канкардат заклікае дзяржаву і БПЦ змагацца з неназванымі “псеўдарэлігійнымі структурамі, якія ўяўляюць небяспеку для асобных людзей і ўсяго грамадства”. БПЦ, у адрозненне ад іншых рэлігійных суполак, атрымлівае субсідыі ад дзяржавы. Акрамя таго, БПЦ валодае выключным правам на выкарыстанне слова “праваслаўны” ў сваёй назве і можа ўжываць у якасці свайго сімвала шасціканцовы Крыж Еўфрасінні Полацкай, святой-заступніцы краіны.

Канкардат таксама служыць асновай пагадненняў паміж БПЦ і асобнымі дзяржаўнымі органамі. Існуе прынамсі тузін такіх пагадненняў, у тым ліку з Міністэрствам абароны, Міністэрствам аховы здароўя і Міністэрствам інфармацыі, а таксама дамова з Міністэрствам адукацыі, якая тычыцца супрацоўніцтва ў галіне адукацыі на перыяд да 2020 года і прадугледжвае сумесныя праекты з мэтай “духоўнага і маральнага выхавання” студэнтаў на аснове традыцый і гісторыі БПЦ.

Закон вызначае тры ўзроўні зарэгістраваных рэлігійных арганізацый: рэлігійныя суполкі, рэлігійныя аб’яднанні і рэспубліканскія рэлігійныя аб’яднанні. Рэлігійныя суполкі павінны ўключаць не менш за 20 чалавек ва ўзросце ад 18 год, што жывуць у адным ці некалькіх суседніх раёнах. Рэлігійныя аб’яднанні павінны ўключаць прынамсі 10 рэлігійных суполак, адна з якіх мусіць дзейнічаць у краіне не менш за 20 год,

і могуць быць утвораныя толькі рэлігійным аб'яднаннем на рэспубліканскім узроўні. Рэспубліканскія рэлігійныя аб'яднанні могуць быць сфармаваныя толькі тады, калі яны ахопліваюць актыўныя рэлігійныя суполкі прынамсі ў чатырох з шасці абласцей краіны.

Згодна з дзяржаўнымі дадзенымі, на 1 студзеня ў краіне было зарэгістравана 25 рэлігійных канфесій і дэнамінацый, якія ахопліваюць 3 375 рэлігійных суполак і 175 рэлігійных аб'яднанняў, манастыроў / кляштараў, місій, братэрстваў, сястрынстваў і школ. У БПЦ налічваецца 1 698 рэлігійных суполак, 15 дыяцэзій, 7 школ, 35 манастыроў, адна місія, 15 братэрстваў і 10 сястрынстваў. Рымска-каталіцкая царква мае 4 дыяцэзіі, 6 школ, 11 місій, 9 кляштараў і 499 суполак. Пратэстанцкія рэлігійныя арганізацыі 14 дэнамінацый маюць 1 037 рэлігійных суполак, 21 аб'яднанне, 22 місіі і 5 школ. Зарэгістравана 34 рэлігійныя суполкі старавераў. Існуе тры іўдзейскія рэлігійныя аб'яднанні – Артадаксальнае, Хабад-Любавіцкае і Рэфарматарскае, якія маюць 53 суполкі, уключна з 10 аўтаномнымі суполкамі. Акрамя таго, зарэгістравана 24 мусульманскія рэлігійныя суполкі - 23 суніцкія і адна шыіцкая.

Рэспубліканскія рэлігійныя аб'яднанні ўключаюць БПЦ, Рымска-каталіцкую царкву, Стараверскую царкву, Саюз евангельскіх хрысціян-баптыстаў, Саюз хрысціян веры евангельскай, Канфедэрацыю цэркваў хрысціян-адвентыстаў сёмага дня, Аб'яднанне Новаапостальскіх цэркваў, Саюз хрысціянскіх цэркваў поўнага Евангелля, Аб'яднанне Сведкаў Іеговы, Саюз евангельска-лютэранскіх цэркваў, Габрэйскі рэлігійны саюз, Аб'яднанне габрэйскіх рэлігійных суполак, Саюз суполак рэфарматарскага іўдаізму, Мусульманскае рэлігійнае аб'яднанне, Духоўны савет мусульманаў і Рэлігійнае аб'яднанне бахаяў.

Для таго, каб атрымаць рэгістацыю, рэлігійная суполка мусіць падаць афіцыйную заяву з наступнай інфармацыяй: спіс імёнаў заснавальнікаў, месца іх пражывання, грамадзянства і асабістыя подпісы; копіі ўстаноўчых актаў; пратакол устаноўчага сходу; дазвол мясцовых уладаў, які пацвярджае права суполкі займаць або выкарыстоўваць якую-кольвечы маёмасць, пазначаную ў яе статуце. Рэлігійная група, раней не зарэгістраваная ўладамі, павінна таксама прадставіць інфармацыю пра сваю веру. Закон прадугледжвае, што ўлады могуць запатрабаваць да шасці месяцаў для разгляду заявы на рэгістрацыю ў сувязі з дадатковай ацэнкай рэлігіі, якую рыхтуе прызначаная дзяржавай камісія экспертаў у галіне рэлігіі. Камісія ацэньвае асноўныя вучэнні рэлігіі,

яе абрады, практыкі, гісторыю, формы і метады дзейнасці; узровень дабрабыту і дабрачынных паслуг; празелітызм і місіянерскую дзейнасць; падыходы да пытанняў шлюбу і сям'і; адукацыйную дзейнасць; стаўленне да аховы здароўя і адпаведнасць патрабаванням заканадаўства. Акрамя таго, суполка павінна прадставіць любыя тэксты, напісаныя яе заснавальнікам, або тыя, што рэлігійнымі паслядоўнікамі лічацца святымі; інфармацыю аб забаронах для святароў і прыхільнікаў культу; спіс краін, дзе гэтая рэлігія шырока распаўсюджаная, і спіс краін, што прызнаюць рэлігію афіцыйна. Там таксама павінна ўтрымлівацца інфармацыя пра краіны, якія адмовіліся прызнаваць гэтую рэлігію, і інфармацыя пра судовы пераслед паслядоўнікаў рэлігіі ў іншых краінах.

Усе заявы на рэгістрацыю разглядаюць абласныя органы ўлады, а таксама ўлады горада Мінска або мясцовыя муніцыпальныя органы ўлады (для арганізацый па-за межамі Мінска). Дапушчальныя падставы для адмовы ў рэгістрацыі дастаткова шырокія і ўключаюць у сябе невыкананне патрабаванняў да стварэння суполкі; няўзгоднены або сфальсіфікаваны статут ці іншы патрабаваны дакумент; парушэнні працэдураў стварэння рэлігійных арганізацый або адмоўную ацэнку прызначанай дзяржавай рэлігійнай экспертнай камісіі. Суполкі могуць аспрэчыць адмову ў судзе.

Для рэгістрацыі ў якасці рэлігійнага аб'яднання або рэспубліканскага рэлігійнага аб'яднання арганізацыя мусіць падаць афіцыйную заяву з копіяй устаноўчых актаў, спіс сябраў кіраўнічага органа з біяграфічнымі звесткамі, пацверджанне дазволу на знаходжанне аб'яднання ў вызначаным месцы і пратаколы яго ўстаноўчага з'езду. Рэлігійныя аб'яднанні валодаюць выключным правам ствараць рэлігійныя навучальныя ўстановы і арганізоўваць кляштарныя і манастырскія суполкі. Усе заявы на стварэнне рэлігійных аб'яднанняў і рэспубліканскіх рэлігійных аб'яднанняў павінны быць пададзены ў Апарат Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцяў, які мае 30 дзён на адказ. Падставы для адмовы з'яўляюцца тымі самымі, як і для рэлігійных суполак, з той розніцай, што яны ўключаюць невыкананне патрабаванняў для стварэння не суполак, а аб'яднанняў. Адмова ці немагчымасць Апарата Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцяў даць адказ цягам 30-дзённага перыяду могуць быць абскарджаныя ў судзе.

Закон абмяжоўвае дзейнасць рэлігійных суполак і аб'яднанняў у вобласці юрысдыкцыі, у якой яны зарэгістраваныя. Закон дазваляе дзяржаўным органам, адказным за рэгістрацыю, выносіць пісьмовыя папярэджанні зарэгіставаным рэлігійным групам за парушэнне любога закона або ажыццяўленне дзейнасці, якая выходзіць за рамкі абавязкаў, пазначаных у статуце арганізацый. Дзяржава можа звярнуцца ў адпаведны суд у залежнасці ад юрысдыкцыі з мэтай закрыць арганізацыю ў выпадку, калі тая не спыніла пазначаную ў пісьмовым папярэджанні незаконную дзейнасць на працягу 6 месяцаў або калі такая дзейнасць паўтараецца цягам аднаго года з моманту вынясення папярэджання. Дзяржава можа прыпыніць дзейнасць рэлігійнай групы да рашэння суда. Закон не ўтрымлівае палажэнняў аб абскарджанні папярэджання або прыпыненні яго дзеяння.

Жыллёвы кодэкс дазваляе рэлігійным арганізацыям ажыццяўляць службу ў жылых памяшканнях, калі мясцовыя ўлады даюць на гэта дазвол. Мясцовыя ўлады мусяць пацвердзіць, што памяшканне адпавядае шэрагу нормаў, у тым ліку патрабаванням супрацьпажарнай бяспекі і аховы здароўя, а таксама санітарным нормам. Такое рашэнне не прымаецца аўтаматычна, і закон не дазваляе рэлігійным арганізацыям праводзіць службу ў прыватных памяшканнях без папярэдняга дазволу мясцовых уладаў.

Паводле закона, усе рэлігійныя арганізацыі павінны атрымаць дазвол на правядзенне мерапрыемстваў, уключна з празелітызмам, па-за межамі сваіх памяшканняў.

Закон патрабуе, каб арганізатары паведамлялі ўладам пра запланаванае ў вызначанай лакацыі масавае мерапрыемства, у тым ліку з удзелам рэлігійных груп, не пазней за 10 дзён да яго правядзення. У выпадку адмовы ўлады павінны паінфармаваць арганізатараў не пазней чым за пяць дзён да правядзення мерапрыемства. Адмова можа выносіцца на адной або дзвюх падставах: канфлікт мерапрыемства з масавымі акцыямі, арганізаванымі іншымі асобамі ці групамі, або неадпаведнасць абвяшчэння пра мерапрыемства адмысловым патрабаванням. Арганізатары масавых мерапрыемстваў па-за межамі вызначаных лакацый мусяць падаваць заяўку за 15 дзён да іх правядзення, а ўлады мусяць даць адказ не пазней чым за пяць дзён да правядзення мерапрыемства. Звычайна ўлады даюць дазвол на правядзенне

штогадовых мерапрыемстаў па-за межамі аб’ектаў, якія належаць рэлігійным групам.

У студзені ўлады зацвердзілі сістэму пакрыцця выдаткаў на працу службаў бяспекі, медыцынскіх і клінінгавых службаў, якія павінны забяспечваць арганізатары масавых мерапрыемстваў, у тым ліку рэлігійных, што праводзяцца па-за межамі рэлігійных памяшканняў і тэрыторый, мітынгаў, конкурсаў, культурніцкіх мерапрыемстваў, фестываляў, канцэртаў і пад. Калі заяўка ўзгодненая, арганізатары мусяць падпісаць кантракты з адпаведнымі службамі за два дні да правядзення мерапрыемства і пакрыць усе выдаткі цягам 10 дзён.

Закон патрабуе, каб усе рэлігійныя арганізацыі атрымлівалі з боку ўладаў папярэдні дазвол на ўвоз і распаўсюд рэлігійнай літаратуры. Працэс прыняцця рашэння ўключае афіцыйны разгляд дакументаў прызначанымі ўрадам экспертамі ў рэлігійных пытаннях.

Нягледзячы на тое, што не існуе закона, які б прадугледжваў сістэматычны працэс рэстытуцыі маёмасці, у тым ліку рэлігійнай, канфіскаванай у савецкі перыяд і перыяд фашысцкай акупацыі, арганізацыі могуць падаць у мясцовыя органы ўлады заяву на рэстытуцыю ўласнай маёмасці. Пры гэтым закон аб рэлігіі, у прыватнасці, забараняе рэстытуцыю канфіскаванай маёмасці, якая на дадзены момант выкарыстоўваецца ў культурніцкіх і спартовых мэтах.

Закон дазваляе аб’яднанням і рэспубліканскім аб’яднанням ствараць школы для навучання духавенства, але забараняе гэта рабіць рэлігійным суполкам.

Толькі зарэгістраваным рэлігійным суполкам, якія ўваходзяць у рэспубліканскія рэлігійныя аб’яднанні, закон дазваляе арганізоўваць пазакласныя рэлігійныя мерапрыемствы ў навучальных установах. Закон гаворыць, што рэспубліканскае рэлігійнае аб’яднанне павінна спачатку заключыць пагадненне аб супрацоўніцтве з Міністэрствам адукацыі, а БПЦ на сёння з’яўляецца адзінай рэлігійнай арганізацыяй, якая мае такое пагадненне. Студэнты, што жадаюць удзельнічаць у добраахвотнай “духоўнай, грамадзянскай і патрыятычнай адукацыі” ў супрацоўніцтве з рэлігійнымі арганізацыямі, павінны альбо падаць пісьмовую заяву, у якой выразіць сваё жаданне прымаць удзел, альбо забяспечыць згоду на гэта сваіх законных апекуноў. Згодна з законам, “такая адукацыя падвышае дасведчанасць моладзі ў любых рэлігійных

арганізацыях, дзейнасць якіх накіраваная на падрыў суверэнітэту, грамадзянскай згоды і канстытуцыйнага ладу Рэспублікі Беларусь або парушэнне правоў і свабод чалавека”.

Закон забараняе рэлігійным групам, якія ніяк сябе не ідэнтыфікуюць, праводзіць заняткі ў якіх-кольвечы школах. Закон таксама забараняе наведванні прадстаўнікоў замежных рэлігійных місій; місіянерскую дзейнасць; збор ахвяраванняў на карысць рэлігійных груп або складкі ад студэнтаў ці любую іншую дабрачыннасць; распаўсюд рэлігійнай літаратуры, аўдыё-, відэа- і іншых рэлігійных матэрыялаў; правядзенне набажэнстваў, рэлігійных абрадаў і цырымоній і размяшчэнне рэлігійных сімвалаў і атрыбутаў у навучальных установах.

Закон не дапускае па рэлігійных меркаваннях дзейнасць прыватных рэлігійных пачатковых, малодшых і старшых школаў, а таксама хатняе навучанне.

Закон вызначае пакаранне, якое вар’юецца ад штрафаў і да пяці год пазбаўлення волі, за ўхіленне ад абавязковай вайсковай службы для асобаў, якія адмаўляюцца выконваць вайсковы абавязак па прычыне сваіх рэлігійных перакананняў. Закон дазваляе альтэрнатыўную грамадзянскую службу асобам, якія адмаўляюцца служыць у войску паводле меркаванняў сумлення. Паводле закона, асобы, якія ўхіляюцца ад альтэрнатыўнай грамадзянскай службы, могуць быць пазбаўленыя волі на тэрмін да 5 год.

Толькі зарэгіставаныя рэлігійныя аб’яднанні могуць звяртацца ў Апарат Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцяў па дазвол на запрашэнне ў краіну замежных святароў. Апарат Упаўнаважанага мусіць даць дазвол да таго, як замежныя рэлігійныя работнікі змогуць служыць у мясцовых кангрэгацыях, выкладаць ці навучацца ў мясцовых установах або браць удзел у дабрачыннай дзейнасці. Такі дазвол звычайна даецца ўрадам тэрмінам на адзін год, і гэты тэрмін можа быць альбо скарочаны, альбо працягнуты. Апарат Упаўнаважанага мае 30 дзён для адказу на запыт аб выдачы візы замежнаму духавенству (рэлігійныя візы) і можа адхіліць запыт без тлумачэння прычынаў. Апеляцыі ў такім выпадку не прадугледжаныя.

Паводле закона, урад дазваляе замежным місіянерам займацца рэлігійнай дзейнасцю толькі на той тэрыторыі, дзе зарэгістравана іх рэлігійнае аб’яднанне. Пераводы замежных святароў у межах рэлігійнага

аб’яднання, у тым ліку з адной парафіі ў іншую, патрабуюць папярэдняга дазволу з боку ўладаў. Паводле закона, замежнікі не могуць узначальваць рэлігійныя арганізацыі. Улады могуць выносіць вымовы і высылаць замежных грамадзян, якія афіцыйна знаходзяцца ў краіне для выканання нерэлігійнай працы, у выпадку, калі тыя ажыццяўляюць якую-кольвечы рэлігійную дзейнасць. Праваахоўныя органы па ўласнай ініцыятыве або па рэкамендацыі іншых дзяржаўных органаў, да прыкладу, службаў бяспекі, могуць патрабаваць, каб замежныя святары пакінулі краіну, і гэтае рашэнне не можа быць аспрэчанае.

Краіна з’яўляецца ўдзельнікам Міжнароднага пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах.

Правапрымяняльная дзяржаўная практыка

У траўні ўлады вызвалілі з-пад варты Мехрдада Джамшыдыяна, які перайшоў у хрысціянства, і "з гуманітарных меркаванняў” адмянілі загад аб ягонай дэпартацыі ў Іран, дзе яму можа пагражаць смяротнае пакаранне, а ў чэрвені ўрад дазволіў яму падаць заяву на атрыманне новага дазволу на часовае пражыванне пасля адклікання ранейшага віду на жыхарства ў сувязі з абвінавачаннем у махлярстве і заканчэннем тэрміну дзейнасці ягонага іранскага пашпарта. Джамшыдыян, які пражываў у Беларусі з 1993 года, заявіў, што прыняў хрысціянства ў 2002 г. Радыё Свабода паведамляе пра тое, што яго адвакаты і Камітэт ААН па правах чалавека сцвярджаюць, што ягоны пераход у хрысціянства перашкодзіць яму атрымаць справядлівы суд у Іране і яму можа пагражаць смяротнае пакаранне за адступніцтва. Джамшыдыян заставаўся ў краіне да канца года.

Праваабаронцы раскрытыкавалі ліпеньскія змены ў палажэнне аб пакараннях за арганізацыю, кіраванне альбо ўдзел у незарэгістраваных рэлігійных арганізацыях, што дазваляюць міліцыі ўводзіць штрафныя санкцыі без судовага рашэння, і назвалі іх "асабліва трывожнымі". Спецдакладчык ААН па сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі Анаіс Марын станоўча ацаніла ліпеньскія змены ў крымінальны кодэкс, у выніку чаго меры пакарання для незарэгістраваных рэлігійных груп дэкрыміналізаваліся і перайшлі ў сферу дзеяння адміністрацыйнага кодэкса, аднак адзначыла, што гэтыя змены былі толькі "невялікімі крокамі”.

Хрысціянскія арганізацыі працягвалі заяўляць, што патрабаванні да рэгістрацыі рэлігійных арганізацый заставаліся складанымі і цяжкімі для выканання, што, па іх словах, абмяжоўвала іх дзейнасць, душыла свабоду рэлігіі і легалізавала крымінальны пераслед асобаў за іх рэлігійныя перакананні. Яны паведамлялі, што прынцыпы, якімі кіравалася дзяржава пры ацэнцы заяваў на рэгістрацыю, заставаліся даволі шырокімі і па-ранейшаму давалі падставу ўладам для адхілення заяваў на рэгістрацыю тых арганізацый, якія яны лічылі непажаданымі.

Цягам года ўлады ў Лідзе, Барысаве і Вілейцы адхілялі заявы суполкі Сведкаў Іеговы. Улады таксама працягвалі адмаўляць у рэгістацыі шэрагу пратэстанцкіх рэлігійных суполак, у тым ліку прадстаўнікам Саюза хрысціянскіх цэркваў поўнага Евангелля ў Маладзечне. У ліпені гарадскія ўлады ў шосты раз адхілілі заяву на рэгістрацыю суполкі пяцідзясятнікаў у Мінску. Як і пры папярэдніх адмовах, пачынаючы з 2017 года, чыноўнікі заяўлялі, што памяшканне, прадстаўленае суполкай, не адпавядае патрабаванням. Сведкі Іеговы паведамілі, што спробы зарэгістраваць рэлігійныя суполкі былі сем разоў адхіленыя ўладамі горада Вілейкі Мінскай вобласці і восем разоў уладамі горада Ліды Гродзенскай вобласці, пачынаючы з 2004 і 2000 года адпаведна. Іх суполцы ў Барысаве Мінскай вобласці было неаднаразова адмоўлена ў рэгістрацыі, пачынаючы з 1998 года, і апошні раз гэта адбылося ў ліпені бягучага года.

Незалежныя рэлігійныя эксперты працягвалі паведамляць пра тое, што рэлігійныя меншасці, як і раней, неахвотна падавалі заявы на рэгістрацыю, паколькі сябры арганізацый па-ранейшаму не хацелі даваць свае імёны ў рамках працэсу падачы заяваў праз страх перад пераследам і пакараннем з боку ўладаў. Акрамя таго, некаторыя з іх казалі, што яны не паведамлялі пра адмову ў рэгістрацыі, паколькі верылі, што калі не будуць разгалошваць факт адмовы, то і далей змогуць весці перамовы з уладамі аб рэгістрацыі суполак.

Па стане на канец года дзяржава не зрабіла ніякіх захадаў у сувязі з дадзенымі ў лістападзе 2018 года Камітэтам ААН па правах чалавека рэкамендацыямі аб адмене патрабавання абавязковай дзяржаўнай рэгістрацыі рэлігійных суполак.

Шматлікія незарэгістраваныя рэлігійныя арганізацыі паведамлялі, што працягвалі падтрымліваць мінімальную бачную прысутнасць у сувязі з, як яны лічаць, варожым стаўленнем да іх дзяржавы і страхам крымі-

нальнага пераследу. На думку незалежных рэлігійных экспертаў, многія зарэгістраваныя рэлігійныя суполкі таксама не жадалі паведамляць пра нападкі і абмежаванні, баючыся пакарання. Паводле праваабарончай арганізацыі па садзеянні свабодзе веравызнання “Форум 18”, шэраг незарэгістраваных рэлігійных суполак паведамляў, што пакуль яны мінімальна бачныя, улады не звяртаюць на іх увагі.

Нетрадыцыйныя рэлігійныя арганізацыі працягвалі заяўляць, што працэдуры рэгістрацыі і выкарыстання жылых памяшканняў для правядзення рэлігійных сходаў заставаліся грувасткімі і адвольнымі. У верасні ўлады горада Жодзіна не падоўжылі мясцовай суполцы Сведкаў Іеговы тэрмін дзеяння дазволу на правядзенне рэлігійных службаў у прыватным доме пасля шэрагу год, калі ім было гэта дазволена рабіць. Па стане на канец года суполка працягвала весці перамовы з уладамі.

Праваабарончыя групы адзначалі пашырэнне доступу мусульманскіх і пратэстанцкіх святароў да зняволеных у турмах. Улады працягвалі даваць БПЦ і, у некаторых выпадках, каталіцкаму духавенству дазвол на рэгулярнае наведванне вернікаў у турме, а многія турмы мелі дачыненні з праваслаўнымі рэлігійнымі ўстановамі.

Сведкі Іеговы паведамлялі, што Мінскія гарадскія ўлады ўзгаднілі запыт нацыянальнага аб’яднання на правядзенне ў горадзе кангрэса ў перыяд з 26 па 28 ліпеня. У мерапрыемстве без аніякіх перашкод узяла ўдзел прыкладна 8 000 сябраў аб'яднання ў параўнанні з прыкладна 9 000 летась.

Біскуп Саюза евангельскіх хрысціян-баптыстаў Леанід Міховіч паведаміў журналістам, што Мінскія гарадскія ўлады не далі дазвол Саюзу на правядзенне ў горадзе Міжнароднага фестывалю надзеі, запланаванага на 3-5 траўня. Міховіч заявіў, што афіцыйныя прадстаўнікі Апарату Упаўнаважанага ў справах рэлігій і нацыянальнасцяў паведамілі яму, што БПЦ выказалася супраць гэтага мерапрыемства, на якое Саюз у якасці каспонсараў запрасіў вядомага амерыканскага евангеліста і яго арганізацыю. Асобна Апарат Упаўнаважанага адмовіўся выдаць дазвол аднаму з гэтых евангелістаў на выступ з казанню на канферэнцыі і перад баптысцкімі суполкамі.

Паводле інфармацыі розных назіральнікаў, улады па-ранейшаму сачылі за дзейнасцю разнастайных пратэстанцкіх рэлігійных

меншасцяў. На іх думку, дзяржаўныя “ідэолагі” (чыноўнікі, адказныя за рэалізацыю дзяржаўных палітычных і сацыяльных прынцыпаў) працягвалі ажыццяўляць маніторынг дзейнасці сябраў незарэгістраваных рэлігійных груп на іх працоўных месцах, хоць паведамленняў пра факты судовага пераследу ў дачыненні да іх не паступала. Прадстаўнікі дзяржаўных органаў, паводле звестак, час ад часу праводзілі “нефармальныя” гутаркі з сябрамі рэлігійных арганізацый з мэтай даведацца пра іх дзейнасць. Паводле паведамленняў рэлігійных лідараў, супрацоўнікі органаў дзяржбяспекі таксама працягвалі з мэтай маніторынгу наведваць рэлігійныя службы зарэгістраваных пратэстанцкіх суполак, што сябры суполак расцэньвалі як запалохванне і ціск на іх. Рымска-каталіцкая царква выказала заклапочанасць тым, што ў шэрагу раёнаў краіны мясцовыя ідэолагі патрабавалі, каб царква прадстаўляла ім праграмы нядзельных школ і спісы дзяцей, якія іх наведваюць.

Рэлігійныя групы, перадусім пратэстанты і Сведкі Іеговы, працягвалі паведамляць пра тое, што яны па-ранейшаму асцярожна ставяцца да празелітызму і распаўсюду рэлігійных матэрыялаў праз, паводле іх словаў, агульную атмасферу запалохвання і страх перад пакараннем.

У сваёй штогадовай справаздачы Сведкі Іеговы адзначалі, што яны праводзілі штотыднёвыя рэлігійныя набажэнствы па ўсёй краіне ў Залах царства, якія ім належаць, без умяшальніцтва з боку міліцыі. У справаздачы, аднак, адзначаецца, што мясцовыя ўлады павінны былі спачатку даць дазвол, перш чым яны маглі законна сустрэцца для набажэнстваў па-за Заламі царства, нават калі гэта датычылася прыватных дамоў альбо арандаваных памяшканняў, і рашэнне ўладаў было цяжка прадказальнае. У справаздачы гаворыцца, што ніводная з сустрэч не была сарваная.

Праваслаўная літаратура заставалася даступнай па ўсёй краіне. Паводле інфармацыі ў прэсе, БПЦ магла свабодна займацца празелітызмам без аніякіх абмежаванняў як на тэлебачанні і ў друкаваных СМІ, так і ў публічных месцах. У адрозненне ад іншых рэлігійных груп, БПЦ працягвала ўдзельнічаць у фінансаваных дзяржавай публічных мерапрыемствах, напрыклад, сходах, без неабходнасці атрымання папярэдняга дазволу з боку ўладаў.

У той час як урад рэспублікі цягам года ўзгадняў імпарт неабходнай Сведкам Іеговы літаратуры, прывоз па меншай меры двух з 18 часопісаў так і не быў дазволены.

Рэлігійныя групы на працягу года не імкнуліся рабіць шмат пакупак альбо арандаваць нерухомасць як месца для адпраўлення культу, паколькі былі ўцягнутыя ўрадам і прававой сістэмай у вырашэнне тых складанасцяў, якія ўзніклі ў мінулым. Яны паведамлялі, што пры ажыццяўленні неабходным ім пакупак або арэнды не сутыкаліся з перашкодамі. Перавод жылой нерухомасці ў нерухомасць з мэтай выкарыстання ў рэлігійных мэтах заставаўся праблематычным. Пратэстанцкія арганізацыі заяўлялі, што яны па-ранейшаму знаходзяцца пад больш моцным усціскам, чым іншыя групы, паколькі маюць менш магчымасцяў валодаць рэлігійнымі аб'ектамі і не могуць звяртацца па дазвол на правядзенне рэлігійных дзеянняў у прыватных дамах, паколькі тыя занадта малыя, каб змясціць усіх вернікаў.

У жніўні гарадскія ўлады Мінска адклікалі першапачатковы дазвол на зямельны ўчастак, вылучаны рымска-каталіцкай суполцы Святых Пятра и Паўла і Святога Яўгенія дэ Мазенод, пасля таго як жыхары выказалі пратэст супраць высечкі дрэваў у парку, дзе суполка мусіла была пабудаваць царкву, і вылучылі для гэтых мэтаў новы ўчастак. Дазвол на будаўніцтва на першапачатковым участку быў выдадзены ў 2016 годзе.

15 траўня Міністэрства ўнутраных спраў абвясціла, што за правядзенне мерапрыемстваў па-за межамі звычайных памяшканняў на прызначаных рэлігійных месцах, такіх як могілкі, месцы паломніцтваў і іншыя тэрыторыі, зацверджаныя мясцовымі ўладамі, з рэлігійных суполак плата спаганяцца не будзе. Нягледзячы на гэтую заяву і папярэдняе ўзгадненне з мясцовымі ўладамі, міліцыя выставіла грэка-каталіцкай суполцы ў Віцебску суму ў 3 825 рублёў (1800 даляраў) за правядзенне штогадовай пілігрымкі 9-13 ліпеня. Суполка адмяніла мерапрыемства. Парах Зміцер Грышан з Віцебскай грэка-каталіцкай парафіі Уваскрасення Хрыста распавёў прэсе, што ў штогадовай пілігрымцы, упершыню арганізаванай у 1995 годзе, традыцыйна ўдзельнічала да 100 прадстаўнікоў супольнасці, якія кіраваліся з Віцебска ў Полацк у памяць аб забойстве ў 17 стагоддзі пяці манахаў-базыліянаў. Прадстаўнікі рымска-каталіцкіх, праваслаўных (БПЦ) і пратэстанцкіх суполак заяўлялі, што ўлады не спаганялі з іх плату за правядзенне рэлігійных мера-

прыемстваў; аднак у некаторых выпадках кіраўнікам суполак даводзілася браць на сябе асабістую адказнасць за падтрыманне парадку і бяспекі на такіх мерапрыемствах.

Назіральнікі адзначалі, што прынятая ў студзені сістэма кампенсацый за паслугі аховы, медыцынскіх службаў і прыбіральшчыкаў з боку арганізатараў масавых мерапрыемстваў не была прызначаная для стварэння перашкодаў для правядзення рэгулярных набажэнстваў, і гэтага не адбывалася на практыцы.

У ліпені БПЦ падпісала з Мінскім аблвыканкамам пагадненне, якое прадугледжвае пастаяннае супрацоўніцтва ў сферы адукацыі, сацыяльнай абароны і культуры.

Дзяржава працягвала патрабаваць, каб студэнты выкарыстоўвалі падручнікі, якія, паводле прадстаўнікоў нетрадыцыйных рэлігійных груп, садзейнічалі праявам нецярпімасці да іх, спасылаючыся на раздзелы кніг, у якіх такія групы называліся “сектамі”. Падручнікі апісвалі нетрадыцыйныя рэлігійныя групы як тыя, што "імкнуцца да сцвярджэння выключнасці сваёй ролі, вучэнняў і прынцыпаў", ізаляцыянізму і прызнання сваёй богаабранасці. Хоць падручнікі і не давалі азначэнне прыметніку "нетрадыцыйны", звычайна пад ім разумеліся ўсе іншыя рэлігіі, акрамя каталіцызму, іўдаізму, ісламу і лютэранства.

Паводле інфармацыі СМІ, кіраўніцтва школ сярод усіх зарэгістраваных рэлігійных груп па-ранейшаму супрацоўнічала выключна з БПЦ на падставе канкардату паміж БПЦ і дзяржавай. Школьнае кіраўніцтва працягвала запрашаць святароў БПЦ чытаць лекцыі вучням, арганізоўваць экскурсіі на аб’екты БПЦ і ўдзельнічаць ва ўрачыстасцях, праграмах і гуманітарных праектах БПЦ.

29 студзеня Прэзідэнт Лукашэнка падпісаў указ аб вылучэнні 905 400 рублёў (430 000 даляраў) з рэзервовага фонду на аплату заробкаў прафесарска-выкладчыцкаму складу і служачым, а таксама стыпендый студэнтам семінарый БПЦ. Пратэстанцкія суполкі і Рымска-каталіцкая царква заявілі, што іх школы не атрымлівалі ад дзяржавы ніякай фінансавай падтрымкі.

Па стане на канец года, гарадскія ўлады Мінска яшчэ не вылучылі зямельны ўчастак пад будаўніцтва Мінскай тэалагічнай акадэміі імя святога Яна Паўла II, што было ўзгоднена яшчэ ў 2015 годзе.

Рэлігійныя групы заяўлялі, што ўрад працягваў непаслядоўна прымяняць візавыя правілы, што ўплывала на магчымасць замежных місіянераў жыць і працаваць у краіне. 24 студзеня Канферэнцыя Каталіцкіх біскупаў у Беларусі паведаміла, што ўрад працягнуў дазвол польскаму ксяндзу Сабеславу Тамале яшчэ на паўгода для служэння ў парафіі Святога Францыска ў горадзе Салігорску. Хоць тэрмін яго дзеяння павінен быў скончыцца 31 студзеня, Апарат Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцяў адмовіўся яго працягваць, аднак змяніў сваё рашэнне пасля таго, як блізу 300 жыхароў падтрымалі хадайніцтва аб яго падаўжэнні. У падобнай сітуацыі ў Віцебску, тым не менш, адхілілі ўсе звароты, у тым ліку і падпісаную 600 жыхарамі 4 лютага петыцыю з патрабаваннем дазволіць польскаму ксяндзу Паўлу Кнурэку аднавіць сваю службу ў парафіі Ісуса Міласэрнага, дзе ён да таго служыў 15 год. Апарат Упаўнаважанага не патлумачыў ніякіх прычын такой адмовы, аднак прадстаўнікі суполак заявілі, што неафіцыйна ўлады хочуць, каб мясцовыя рэлігійныя суполкі рыхтавалі ў якасці святароў мясцовых грамадзян, а не разлічвалі на замежнікаў.

Паводле інфармацыі Форума 18, дзяржава працягвала адмаўляць каталіцкаму святару з Расіі Кеменсу Верту ў дазволе на ўдзел у рэлігійнай дзейнасці. Яму было дазволена заставацца ў Віцебску для таго, каб працягнуць будаўніцтва новага касцёла, але забаронена сужыць або праводзіць імшу.

Прадстаўнікі Царквы адвентыстаў сёмага дня ў верасні паведамілі, што імі ў Брэсце супольна з міжнароднымі прыватнымі ды дзяржаўнымі донарамі і мясцовымі ўладамі быў адкрыты новы цэнтр здаровага ладу жыцця. У цэнтр можа патрапіць любы жыхар горада, ён таксама даступны для людзей з інваліднасцю.

Паводле словаў Мінскага Каталіцкага Арцыбіскупа Тадэвуша Кандрусевіча, замежныя святары сутыкаліся са шматлікімі выклікамі: нядаўна прыбылыя святары мусілі праходзіць праз доўгі працэс узгаднення перад тым, як атрымаюць дазвол на правядзенне Імшы, дзяржава часта давала ім візы толькі на перыяд ад трох да шасці месяцаў, і яны нярэдка сутыкаліся з адміністрацыйнымі складанасцямі пры спробе працягнуць тэрмін дзеяння візаў. 11 лютага Арцыбіскуп Кандрусевіч

таксама заявіў, што закон робіць “службу ў краіне для замежных святароў практычна немагчымай”.

Не было дасягнута ніякага прагрэсу ў справе доўгатэрміновага замарожвання актываў Царквы “Новага жыцця” ў 2005 годзе. Царква працягвала выкарыстоўваць памяшканне для рэлігійных мэтаў. Абмеркаванне статусу і дзейнасці царквы паміж кіраўніцтвам царквы і Мінскімі гарадскімі ўладамі па стане на канец года працягвалася.

Улады працягвалі даваць дазвол БПЦ на збор дабрачынных ахвяраванняў як у грамадскіх месцах, так і на тэрыторыі яе рэлігійных аб’ектаў. Хоць закон і не абмяжоўваў іншыя рэлігійныя арганізацыі ў зборы ахвяраванняў у публічных месцах, прадстаўнікі гэтых арганізацый заяўлялі, што ўлады працягвалі абмяжоўваць іх дзейнасць па зборы сродкаў іх уласнымі месцамі адпраўлення культу або іншай маёмасцю. Арганізацыі заяўлялі, што сутыкаліся з пераследам з боку ўладаў, як толькі рабілі спробу збіраць ахвяраванні ў іншых месцах.

26 траўня ўлады Гомеля паведамілі, што выявілі асобу, якая намалявала ў снежні 2014 года свастыку і заклікі "Забівай габрэяў" і "Халакост" на будынку мясцовай габрэйскай абшчыны. Асоба, якая, як паведамляецца, прызнала сваю віну, належыць да неанацысцкай групы, а з 2017 года адбывае пакаранне тэрмінам у сем з паловай год за спробу забойства замежнага студэнта ў Гомелі.

Цягам года габрэйская супольнасць і замежныя донары працавалі сумесна з мясцовымі ўладамі над тым, каб адмыслова ў памяць габрэяў - ахвяраў Халакосту ўзвесці за прыватныя сродкі прынамсі дзевяць помнікаў у вёсках Ушачы, Быцень і Сіроціна, мястэчках Жыткавічы і Івацэвічы, а таксама ў іншых месцах.

25 студзеня з нагоды Міжнароднага дня памяці ахвяраў Халакосту міністр замежных спраў Уладзімір Макей выступіў з заявай, у якой адзначыў: “Мы аб’ядноўваемся, каб аддаць даніну памяці ўсім, хто загінуў у гэтай жахлівай вайне і не дапусціць паўтарэння падобных трагедый”. Ён дадаў, што будучыя пакаленні трэба выхоўваць так, каб у іх быў “устойлівы імунітэт супраць любой ваеннай агрэсіі і нацыяналістычнай варожасці”.

28 сакавіка Прэзідэнт Лукашэнка разам з аўстрыйскім калегам адкрылі помнік 10 000 аўстрыйскім ахвярам Халакосту, загінулым у канцлагеры Трасцянец у Мінску. Лукашэнка заявіў, што "захаванне успамінаў пра

іх з'яўляецца святым” і што "іх забівалі проста за этнічнае паходжанне, за спавяданне чужой для катаў рэлігіі, за адданасць іншай ідэалогіі”.

22 траўня гарадскія ўлады Брэста разам з мясцовай габрэйскай супольнасцю, жыхарамі горада і прадстаўнікамі замежных дзяржаў правялі ўрачыстую цырымонію пахавання парэштак 1 214 ахвяраў Халакосту Брэсцкага гета, якія былі знойдзеныя ў студзені на будаўнічай пляцоўцы ў цэнтры горада. На ўрачыстай цырымоніі выступіў старшыня Камісіі Злучаных Штатаў па ахове амерыканскай спадчыны за мяжой, а мэр Брэста Аляксандр Рагачук абавязаўся захоўваць памяць аб ахвярах і ўвекавечыць памяць аб брацкай магіле і іншых помніках у горадзе, звязаных з габрэямі.

5 чэрвеня Магілёўскія ўлады прызналі мясцовыя габрэйскія могілкі, створаныя ў пачатку 1800-х гадоў, гісторыка-мемарыяльным месцам. Гістарычным габрэйскім могілкам такі статус у краіне быў прысвоены ўпершыню. На могілках захаваліся ўнікальныя надмагільныя помнікі, якія перажылі войны, вандалізм і разбурэнні савецкіх часоў. Мясцовыя актывісты адрамантавалі і каталагізавалі большасць з надмагілляў. Новы статус забараняе на гэтым месцы новыя пахаванні і знішчэнне надмагілляў.

9 кастрычніка будаўнікі раскапалі парэшткі і надмагільныя помнікі на месцы былых габрэйскіх могілак у цэнтральным мінскім парку. Нягледзячы на тое, што габрэйская супольнасць перазахавала некаторыя з раскапаных парэштак і, як паведамляецца, следчыя даследавалі астатнія, гарадскія ўлады адмовіліся прызнаваць парк месцам габрэйскай гісторыка-культурнай каштоўнасці. Габрэйскія суполкі і недзяржаўныя арганізацыі па ахове спадчыны працягвалі звяртацца да ўрада з просьбай абараніць гэтую тэрыторыю ад любых раскопак або будаўнічых работ. Гарадская пракуратура заявіла, што працы па пракладцы камунікацый не парушаюць ніякіх рэгуляцый.

Раздзел III. Статус грамадскай павагі да свабоды веравызнання

Паводле паведамленняў прадстаўнікоў Сведкаў Іеговы, лекары працягвалі прымушаць іх вернікаў рабіць пераліванне крыві як частку працэсу лекавання, нягледзячы на іх адназначную пісьмовую адмову ад гэтай працэдуры.

БПЦ, у прыватнасці мінская парафія Храма Увядзення ў храм Найсвяцейшай Багародзіцы, працягвала штогадовае ўшанаванне ў якасці аднаго са сваіх святых і пакутнікаў малога дзіцяці Гаўрылы Беластоцкага, нібыта забітага габрэямі ў Гродна ў 1690 годзе. Лідары габрэйскай супольнасці зноў выказалі сваю заклапочанасць памінальнай малітвай, якая прагучала ў гадавіну смерці Беластоцкага 3 траўня. Тэкст малітвы ўключаў урывак пра тое, што “мужны Гаўрыла быў адданы пакутніцкай смерці праз падман габрэяў”.

23 сакавіка былі здзейснены акты вандалізму ў дачыненні да двух мемарыяльных камянёў (адзін з іх быў пастаўлены ў памяць габрэйскіх ахвяраў савецкіх рэпрэсій), якія былі распісаныя антысеміцкімі і іншымі паклёпніцкімі заклікамі ва ўрочышчы Курапаты, дзе савецкая ўлада ў перыяд з 1937 па 1941 гады забіла тысячы прадстаўнікоў розных нацыянальнасцяў, у тым ліку і шмат габрэяў. Следчыя адкрылі крымінальную справу аб вандалізме, аднак звестак пра вынікі расследавання не паступала.

Нягледзячы на забарону ўрада, газеты, літаратура і дыскі антысеміцкага характару, часта прывезеныя з Расіі, былі па-ранейшаму дасяжныя. Антысемітызм працягваў існаваць і ў анлайн-прасторы. Так, напрыклад, у пасце ў адным з блогаў адкрыта прыніжаліся прадстаўнікі габрэйскай інтэлігенцыі і задавалася пытанне: "Чаму габрэі павінны вырашаць, што добра, а што дрэнна для беларусаў?"

У Оршы і Салігорску жыхары збіралі подпісы супраць адкрыцця новых цэркваў БПЦ, заявіўшы, што такіх цэркваў ў гэтых гарадах ужо існуе больш чым дастаткова.

Міжрэлігійная працоўная група, якая складалася з прадстаўнікоў БПЦ, Рымска-каталіцкай царквы, Саюза евангельска-лютэранскіх цэркваў і габрэйскіх рэлігійных суполак, арганізоўвала семінары на тэму развіцця і прасоўвання культуры захавання памяці аб Халакосце і аховы помнікаў генацыду з асаблівым акцэнтам на канцлагер Трасцянец у Мінску. Група наведвала месцы памяці ахвяраў Халакосту па ўсёй краіне, арганізоўвала круглыя сталы, прысвечаныя працы з моладдзю і маладымі гісторыкамі, якія займаюцца даследаваннямі Халакосту, і праводзіла дыскусіі на тэму, якім чынам памяць пра гісторыю Трасцянца звязана з дэмакратычнымі каштоўнасцямі і як ўнёсак рэлігійных супольнасцяў спрыяе прымірэнню паміж народамі

Беларусі і Германіі. Група правяла таксама шэраг сумесных малітваў, у тым ліку на месцы масавых забойстваў у Курапатах ў сталінскія часы.

Раздзел IV. Палітыка і дзейнасць урада ЗША

У чэрвені Часовы Павераны і іншыя супрацоўнікі амбасады ЗША сустрэліся з прадстаўнікамі Апарата Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцяў для таго, каб абмеркаваць пытанні веравызнання і выказаць заклапочанасць захаваннем месцаў габрэйскай спадчыны. Часовы Павераны рэгулярна цягам усяго года ўздымаў пытанні свабоды веравызнання, рэгістрацыі рэлігійных суполак і антысемітызму на самым высокім дзяржаўным узроўні.

У траўні прадстаўнікі амбасады разам са старшынём Камісіі ЗША па ахове амерыканскай спадчыны за мяжой узялі ўдзел у цырымоніі пахавання парэштак ахвяраў габрэйскага гета ў Брэсце. Старшыня таксама наведаў будаўнічую пляцоўку, дзе былі раскапаныя парэшткі, каб забяспечыць поўнае выкананне працэдур іх вывазу ў адпаведнасці з габрэйскімі традыцыямі.

Часовы Павераны і іншыя супрацоўнікі амбасады працягвалі рэгулярна сустракацца з прадстаўнікамі БПЦ, Рымска-каталіцкай царквы і рэлігійных меншасцяў. З габрэйскімі рэлігійнымі арганізацыямі яны абмяркоўвалі праявы антысемітызму і захавання габрэйскай рэлігійнай спадчыны, а са Сведкамі Іеговы і пратэстанцкімі суполкамі - дзяржаўныя абмежаванні іх рэгістрацыі і дзейнасці. Супрацоўнікі амбасады таксама працягвалі праводзіць рэгулярныя абмеркаванні абмежаванняў свабоды веравызнання з актывістамі, якія выступаюць за рэлігійную свабоду, рэлігійнымі лідарамі, юрыстамі рэлігійных арганізацый і прадстаўнікамі ініцыятывы “За свабоднае веравызнанне” (група актывістаў грамадзянскай супольнасці, якая прасоўвае ідэі рэлігійнай цярпімасці). Супрацоўнікі амбасады цягам года размяшчалі ў сацыяльных сетках прамовы Дзяржсакратара і іншыя матэрыялы, датычныя свабоды веравызнання.